***В. У. Рагачова,***
*канд. педагагічных навук, дац.,*
*дац. каф. педагогікі СКД БДУКМ*

# ДЫФЕРЭНЦЫРАВАНЫ ПАДЫХОД І ЯГО ЎЛІК У АРГАНІЗАЦЫІ КУЛЬТУРНА-АДПАЧЫНКАВАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў САНАТОРНА-КУРОРТНЫХ УСТАНОВАХ

На сучасным этапе развіцця нашай краіны ўсё большую папулярнасць набывае турызм як спосаб арганізацыі вольнага часу грамадзян. Гэтаму спрыяе інтэнсіфікацыя працы, якая патрабуе эфектыўнага ўзнаўлення страчаных на вытворчасці псіхічных і фізічных сіл чалавека, павялічэнне колькасці вольнага часу і фарміраванне стаўлення да яго як да каштоўнасці. У сувязі з гэтым не толькі павялічваецца колькасць санаторна-курортных устаноў, але і ў значнай ступені перабудоўваецца змест культурнага абслугоўвання адпачывальнікаў. Так, ідзе актыўнае запазычванне і адаптацыя вопыту замежных курортаў, укараняюцца новыя тэхналогіі індустрыі забаў, змяняецца структура выкарыстання вольнага часу, актывізуецца гастрольная і канцэртная дзейнасць прафесіяналаў тэатра і эстрады і інш.

Аднак, нягледзячы на значныя пазітыўныя змены ў гэтай сферы, неабходна адзначыць і шэраг праблем, з якімі сутыкаюцца арганізатары культурна-адпачынкавай дзейнасці ў санаторна-курортных установах: невыкананне профілю і спецыялізацыі здраўніц, што прыводзіць да фарміравання змешанага кантынгенту з рознымі інтарэсамі; супярэчнасць паміж неабходнасцю выканання лячэбна-ахавальнага рэжыму і дасугавай актыўнасцю, асабліва выяўленай у вячэрні час; неадпаведнасць формаў і метадаў дзейнасці работнікаў дасугавай сферы ўзросламу культурнаму ўзроўню адпачывальнікаў; адставанне матэрыяльнай базы дасугавай сферы ад сучасных патрабаванняў.

Рашэнне большасці пералічаных праблем магчыма з улікам дыферэнцыраванага падыходу да арганізацыі адпачынку і забаў. З'яўляючыся адным з найважнейшых прынцыпаў культурна-адпачынкавай дзейнасці, дыферэнцыраваны падыход прадугледжвае арганізацыю вольнага часу з улікам спецыфічных асаблівасцяў розных груп адпачывальнікаў як аднаго з не-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абходных умоў дзейснасці і выніковасці культурна-забаўляльных мерапрыемстваў.

Прынцып дыферэнцыраванага падыходу пры арганізацыі культурна-адпачынкавай дзейнасці прадугледжвае, перш за ўсё, неабходнасць уліку ўзросту, полу, нацыянальнасці, адукацыйнага ўзроўню, узроўню даходаў, прафесійных інтарэсаў і г. д.

Сёння часцей за ўсё прынята класіфікаваць адпачывальнікаў па ўзроставай прыкмеце: 3–10 гадоў – дашкольнікі і малодшыя школьнікі; 11–18 гадоў – падлеткі-школьнікі; 19–25 гадоў – моладзь, студэнты; 26–64 гадоў – дарослыя людзі; 65 гадоў і старэй – пажылыя людзі, пенсіянеры.

Абапіраючыся на вядучы тып дзейнасці і ўзроставыя асаблівасці, розным катэгорыям, якія адпачываюць у санаторна-курортных установах, можна прапаноўваць наступныя формы культурна-дасугавай дзейнасці.

Для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту вядучым відам дзейнасці з'яўляецца гульня. Таму актуальнымі будуць гульнятэкі, ранішнікі, казачныя экскурсіі, конкурсы песень, малюнкаў, рухомыя гульні. Падлеткі ўжо валодаюць шырокім колам інтарэсаў і досыць патрабавальна ставяцца да прапанаваных формаў правядзення вольнага часу. Чым разнастайней жыццё дзяцей у гэтым узросце, тым яно ім больш падабаецца, таму школьнікам можна прапаноўваць экскурсіі, спартыўныя спаборніцтвы, конкурсы, віктарыны, эстафеты, інтэлектуальныя гульні, школу лідэраў, дыскатэкі і святы. Для моладзі праграмы змяняюцца. Ужо сфарміраваны характар і светапогляд, ёсць пэўнае разуменне і бачанне сябе. Пераважнымі відамі дзейнасці ў гэты перыяд з'яўляюцца вучоба і праца, якія патрабуюць вялікай напругі сіл. Але маладосць – гэта перыяд найбольшай актыўнасці асобы, таму ў праграму вольнага часу для маладых людзей трэба ўключаць: КВНы, дыскатэкі, кірмашы, тэатральныя паказы, фестывалі, шоу, спартыўныя спаборніцтвы, экскурсіі і турыстычныя паходы, інтэлектуальныя і дзелавыя гульні, квэсты і інш. Для людзей сярэдняга ўзросту, дарослых, працаздольных людзей, якія імкнуцца адпачыць ад паўсядзённай працы, падыдуць больш спакойныя мерапрыемствы: свецкія салоны, конкурсы, літаратурныя гасцёўні, творчыя вечары, прэзентацыі, канцэрты. Для пажылых людзей, якім усё часцей хочацца ўспомніць свае маладыя гады і ўсё, што з імі звязана, нядрэнна прапанаваць такія формы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

правядзення вольнага часу, як вячоркі, вечары раманса, майстар-класы, выставы сваіх работ і інш. [2].

Разам з тым неабходна ўлічваць і індывідуальныя асаблівасці адпачывальнікаў. Так, людзям з актыўнымі формамі працы, з вялікай фізічнай нагрузкай будзе карысны адпачынак-разрадка, які здымае напружанне, стомленасць, стрэсавы стан. Для тых, хто вядзе сідзячы лад жыцця, мала рухаецца, патрэбна на адпачынку зарадка і актывізацыя [3]. Акрамя таго, чалавек павінен атрымліваць ад вольнага часу маральнае задавальненне. Таму для таго, каб правільна скласці праграму адпачынку, арганізатару культурна-адпачынкавай дзейнасці неабходна ведаць, як чалавек жадае праводзіць свой вольны час.

У сваіх даследаваннях Н. І. Гаранін і І. І. Булыгіна прапануюць таксама класіфікаваць адпачывальнікаў па іх адносінах да адпачынку [1]. Згодна з гэтым падыходам вылучаюць некалькі тыпаў адпачывальнікаў.

1. Ініцыятыўныя адпачывальнікі, якія загадзя плануюць як працоўныя дні, так і дні адпачынку, таму абсалютна дакладна ведаюць, што жадаюць атрымаць ад адпачынку ў санаторна-курортнай установе. Асноўная задача арганізатара вольнага часу ў рабоце з імі – уменне ўважліва выслухаць і знайсці магчымасць выканаць амаль гатовую праграму. Тут неабходная імправізацыя і ні ў якім выпадку не дапушчальны перахоп ініцыятывы.

2. Дзелавыя людзі – гэта людзі, якія ў цэлым маюць малы аб’ём вольнага часу і нават на адпачынку імкнуцца правесці час з карысцю. Гэты тып адпачывальнікаў аддае перавагу альбо такому адпачынку, які дае ім магчымасць ўдасканальвацца (дзелавыя гульні, навуковыя дыспуты і інш.), або выбіраюць максімальна спакойны адпачынак, які дапаможа ім расслабіцца і адпачыць ад актыўнага тэмпу жыцця (рыбалка, пікнік і інш.).

3. «Вузкаспецыялізаваныя» адпачывальнікі, якія маюць нейкае адно вялікае захапленне ў жыцці: калекцыянаванне, канструяванне, мадэляванне, гістарычная рэканструкцыя, ролевыя гульні і да т.п. Гэтай справе яны прысвячаюць увесь свой вольны час, таму ім больш за ўсё падыходзіць клубны адпачынак. Менавіта ў клубе па інтарэсах так адпачывальнік атрымае самае вялікае маральнае задавальненне.

4. Адпачывальнікі, якія аддаюць перавагу максімальна актыўнаму вольнаму часу: спартыўныя гульні, удзел у спаборніцтвах

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і розных мерапрыемствах. Такія адпачывальнікі схільныя падтрымліваць любую прапанову арганізатара вольнага часу. Праграму для іх трэба складаць з разлікам на максімальную рухальную актыўнасць.

5. Пасіўныя адпачывальнікі – гэта людзі, схільныя да хатніх формаў вольнага часу: чытання кніг, прагляду тэлевізійных праграм, шматгадзіннаму адпачынку на пляжы. Для такога тыпу адпачывальнікаў падыдуць праграмы, у якія ўключаны гульні на пляжы, відэатэка, вячэрнія шоу.

6. Гэтак жа прынята вылучаць яшчэ адзін тып – гэта непапраўныя скептыкі і незадаволеныя. Гэта найбольш складаная катэгорыя, бо іх вельмі цяжка чым-небудзь захапіць. Аднак пры разнастайнасці прапанаваных праграм, магчыма, і яны знойдуць сабе забаву.

Такім чынам, можна сказаць, што ўлік дыферэнцыраванага падыходу ў арганізацыі культурна-адпачынкавай дзейнасці ва ўстановах санаторна-курортнага тыпу рэалізуецца ва ўменні арганізатара вольнага часу распазнаваць і ўлічваць асаблівасці кожнага з гэтых тыпаў асобы адпачывальнікаў пры складанні забаўляльных праграм. Для палягчэння гэтай цяжкай задачы неабходна: збіраць інфармацыю аб адпачываючых (узрост, пол, прафесія, ступень актыўнасці, любімыя віды адпачынку) на ўсіх этапах яго абслугоўвання; ведаць і ўмець класіфікаваць адпачывальнікаў, каб правільна падабраць для іх праграму; мець вялікі запас разнастайных праграм, разлічаных на розныя катэгорыі адпачывальнікаў.


1. *Гаранин Н.* Менеджмент туристской и гостиничной анимации: учеб. пособие / Н. Гаранин, И. Булыгина. – М., 2017. – 128 с.

2. *Ерошенков, И. Н.* Возрастные технологии социально-культурной деятельности : учеб. пособие / И. Н. Ерошенков. – М. : МГУКИ. – 2011. – 302 с.

3. Психология человека от рождения до смерти / В. А. Аверин и др. ; под общ. ред. А. А. Реана. – СПб. : Прайм-Еврознак : Изд. дом «Нева». – М. : Олма-пресс, 2001. – 652 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ